вития страны идет объединение народа на принципах национальной идеи, каковой является патриотизм. Но в то же время нравственно-патриотическое воспитание детей и молодежи не может быть организовано лишь органами государственной власти без участия юного поколения, прежде всего объединенного в массовые организации патриотической направленности. Именно данные объединения должны стать проводниками национальных идей во имя сохранения и развития государства, как это было в прошлом веке.

---

*1.* Вожатый: журнал / ЦК ВЛКСМ. – 1928, февр. – М. : Молодая гвардия.

*2.* Всесоюзная пионерская организация им. В. И. Ленина: Документы и материалы. 1920–1972 гг. – М., 1972. – 304 с.

*3.* О государственной программе «Патриотическое воспитание граждан Российской Федерации на 2016–2020 годы» [Электронный ресурс] : Постановление Правительства РФ, 30 дек. 2015 г., № 1493 (ред. от 20.11.2018). – Режим доступа: http://www.consultant.ru/document/cons_doc_LAW_192149. – Дата доступа: 09.10.2019. – Загл. с экрана.

*4.* Отчет Центрального комитета ВЛКСМ VIII всесоюзному съезду. – М. : Молодая гвардия, 1928. – 152 с.

# ЗАХАВАННЕ І АКТУАЛІЗАЦЫЯ КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ БЕЛАРУСІ Ў РЭГІЁНАХ: ЭКСПАЗІЦЫІ МУЗЕЯЎ І ПРЫВАТНЫЯ ЗБОРЫ (па матэрыялах айчынных СМІ)

***А. Я. Паўлава,***
*кандыдат гістарычных навук,*
*дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

Пры вывучэнні дзейнасці айчынных музеяў на сучасным этапе незаслужана мала ўвагі надаецца такім крыніцам, як СМІ. Падобныя даследаванні неабходныя, бо сродкі масавай



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

інфармацыі, як электронныя, так і друкаваныя, з’яўляюцца адным з важных сацыяльных інстытутаў сучаснага жыцця. Будучы звязанымі з працэсамі цыркуляцыі інфармацыйных патокаў у грамадстве, яны патрабуюць пільнай увагі.

Па выніках вывучэння артыкулаў можна ўмоўна выдзяліць некалькі тэматычных груп. Самую вялізную па колькасці прыкладаў групу складаюць рэпартажы аб адкрыцці выставак. Новай з’явай для рэгіянальных краязнаўчых музеяў сталі выстаўкі аднаго экспаната «Унікальны экспанат». Гэта цыкл міні-выстаў, дзе наведвальнікі, акрамя асноўнай экспазіцыі, змогуць убачыць музейны прадмет, які захоўваецца ў фондах, аднак ніколі раней не выстаўляўся. Толькі за 2015 г. у Брэсцкім абласным краязнаўчым музеі адбыліся тры падобныя выстаўкі. Згодна матэрыялам «СБ. Беларусь сегодня», музейныя супрацоўнікі кожны раз падтрымлівалі інтрыгу: тайна аб выстаўляемым у якасці ўнікальнага экспаната музейным прадмеце захоўвалася аж да адкрыцця выставак [1].

Да прыгаданай групы можна аднесці шматлікія матэрыялы пра адкрыццё музейных устаноў і аднаўленне сядзіб у невялікіх населенных пунктах [8; 9; 10]. Дзякуючы газеце «СБ. Беларусь сегодня» можна даведацца пра станоўчы вопыт супрацоўніцтва музеяў абласнога падпарадкавання з мясцовымі актывістамі пры стварэнні новых музейных устаноў. У 2014 г. у Вялікай Бераставіцы адкрыўся Музей ваверкі, створаны пры дапамозе супрацоўнікаў Гродзенскага гісторыка-археалагічнага музея і мясцовых жыхароў. Варта адзначыць, што нават пры стварэнні падобных тэматычных музеяў частка прасторы гэтых устаноў традыцыйна для нашай краіны адводзіцца пад краязнаўчую экспазіцыю [21].

Як сведчыць артыкул у газеце «Звязда», незвычайныя музеі стравающца і намаганнямі дзяржаўных структур. У Слаўгарадскім раёне адкрыўся ўнікальны музей пад адкрытым небам – імітацыя бою рускіх са шведамі пры Лясной у 1708 г. На плошчы амаль гектар раскінуліся абарончыя ўма-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цаванні, зброя, невялічкі храм і нават пластыкавае войска дзвюх армій [3]. Ініцыятыва рэалізавана ў рамках праекта ЕС–ПРААН «Садзейнічанне развіццю на мясцовым узроўні ў Рэспубліцы Беларусь», аўтарамі сталі Лапаціцкі сельсавет і цэнтралізаваная сетка публічных бібліятэк Слаўгарадскага раёна. Гэты музей – добры прыклад ініцыятыўнага і творчага падыходу ў развіцці турыстычнага і экскурсійнага патэнцыялу рэгіёна.

На працягу апошніх гадоў назіраецца значнае павелічэнне публікацый аб ініцыятывах энтузіястаў-калекцыянераў да стварэння прыватных музеяў. Яскравымі прыкладамі могуць служыць матэрыялы «СБ» і TUT.BY. Так, можна даведацца аб гісторыі стварэння музея «Брэст тэатральны» ў СШ № 12, дзякуючы намаганням Г. Ф. Кавалёвай, якая больш за 40 гадоў збірала прадметы музейнага значэння [6]. Інтэрнет партал TUT.BY распавёў пра Цікавы музей у Гродна, створаны калекцыянерам з 20-гадовым стажам А. Ёршам, стваральнікам музея праса [22].

Наступную групу складаюць артыкулы пра гісторыю фарміравання музейных збораў. Вывучэнне публікацый дазволіла вызначыць некалькі шляхоў папаўнення музейных збораў. Так, «СБ» неаднаразова распавядала аб папаўненні фондаў, дзякуючы намаганням энтузіястаў збораў рэгіянальных музеяў [15]. Другі варыянт – абвясціць для насельніцтва акцыю аб падараванні музею прадметаў, што могуць узбагаціць калекцыю [20]. Такім шляхам падчас адзначэння ў 2017 г. 150 гадоў з часу будаўніцтва асабняка знакамітага роду Мяшчэрскіх каля 250 прадметаў узбагацілі калекцыю Клімавіцкага раённага краязнаўчага музея. Аднак не заўсёды каштоўныя артэфакты, якія энтузіясты ці прафесійныя даследчыкі жадаюць перадаць у музей, трапляюць у фонды. Музейныя ўстановы не маюць права камплектавацца каштоўнымі прадметамі без неабходнай дакументацыі. Спрэчныя сітуацыі, такія як лёс археалагічнай калекцыі Л. Калядзін-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

скага ў Слуцкім краязнаўчым музеі, таксама становяцца тэмай для журналісцкага рэпартажа [19].

Рэалізацыя функцыі дакументавання прадугледжвае ў якасці важнага кірунка дзейнасці камплектаванне прадметамі музейнага значэння, што адносяцца менавіта да другой паловы XX ст. Аналіз рэпартажаў праекта TUT.BY сведчыць, што рэгіянальныя музеі актыўна займаюцца гэтай дзейнасцю. Як вынікае з матэрыялаў «СБ. Беларусь сегодня», энтузіясты, жадаючыя стварыць новыя музеі, часам перабіраюцца ў Беларусь з суседніх краін. Так, напрыклад, у весцы Яроміна пад Віцебскам з’явіўся бясплатны музей мапедаў, створаны былым масквічом У. Мячыным. Стваральнік музея раней з’яўляўся супрацоўнікам маскоўскага Музея індустрыяльнай культуры і галоўнай мэтай стварэння музея лічыць ідэю раздзяліць сваё захапленне з іншымі людзьмі, дзеля чаго і прапрацоўвае магчымасці набліжэння месца размяшчэння музея да асноўных турыстычных плыняў [17].

У 2014 г. пры інфармацыйнай падтрымцы TUT.BY і Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь з мэтай папулярызацыі нацыянальнай культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь створаны праект «Музеі Беларусі з “Белкарт” – гэта віртуальныя экскурсіі па музеях нашай краіны вачыма фотарэпарцёраў (170 музеяў і іх філіялаў). Менавіта недастатковае асвятленне і ўвага да музейнай тэматыкі ў СМІ Беларусі паслужыла галоўным матывам для запуску праекта. Задачай праекта арганізатары назвалі неабходнасць звярнуць увагу грамадскасці на культурную спадчыну Беларусі, павысіць цікавасць беларусаў да музеяў. Сярод аб’ектаў, зацікавіўшых журналістаў, асобая ўвага надавалася рэгіянальным і прыватным музеям. У артыкулах аўтары не толькі звярталіся да апісання калекцыі і існуючай экспазіцыі, але і ацэньвалі апошнюю з пункту гледжання адпаведнасці сучасным тэндэнцыям. Важным вынікам рэалізацыі праекта стаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

аналіз журналістамі існуючай у рэгёнах турыстычнай інфраструктуры.

Апублікавана каля 200 грунтоўных фотарэпартажаў, значная колькасць якіх засяроджвае ўвагу на зборах і дзейнасці менавіта музеяў у рэгіенах. Аналіз артыкулаў дазваляе зрабіць выснову аб намаганнях супрацоўнікаў, не толькі максімальна шырока прадставіць свае зборы ў экспазіцыях, але і прапанаваць наведвальнікам сучасныя інтэрактыўныя праграмы, што скіраваны на захаванне сярод насельніцтва ведаў аб традыцыйных занятках. У якасці прыклада можна прывесці матэрыял пра мемарыяльны музей Лепяшынскіх у Кармянскім раёне. Наведвальнікі могуць пазнаеміцца не толькі з жыццем і дзейнасцю знакамітага савецкага педагога, але і з краязнаўчай экспазіцыяй. Арганізаваная ў этнаграфічнай зале для дзяцей прастора дазваляе далучыць іх да музейнай культуры і навучыць асновам ткацтва і пляцення з лазы [12].

Як сведчыць аналіз турыстычных пераваг, на сучасным этапе вельмі актуальным кірункам для суайчыннікаў і замежных гасцей з’яўляецца наведванне раёнаў, блізкіх да ЧАЭС. Адным з матэрыялаў праекта «Музеі Беларусі разам з “Белкарт”» стаў рэпартаж з Нараўлянскага гісторыка-этнаграфічнага музея. Як вынікае з артыкула, гэтая музейная ўстанова, размясціўшаяся ў помніку драўлянага дойлідства XIX ст., яскрава дэманструе ў сваёй экспазіцыі спалучэнне традыцыйных для мясцовых музеяў кірункаў (сабраныя ў выніку экспедыцый супрацоўнікаў этнаграфічная калекцыя і фотаархіў) з актуальнай тэматыкай уплыву на прыгаданы раён наступстваў аварыі на ЧАЭС, дзе класічнае афармленне экспазіцыі ўключае і наяўнасць сучасных інсталяцый («Дрэва жыцця» ў памяць аб 36 адселеных вёсках раёна). З мэтай адпавядаць актуальным тэндэнцыям і зацікавіць гасцей краю супрацоўнікамі музея распрацаваны турыстычны этнаграфічны маршрут с дэгустацыяй мясцовых страў [14].



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Праблемныя артыкулы ў айчынных СМІ прысвечаны здабыткам і праблемам у дзейнасці музейных устаноў краіны. У дадзеным выпадку журналісты выступаюць у якасці незалежнага наведвальніка і даследчыка сітуацыі. Гэтыя абставіны дазваляюць падрыхтаваць нават для дзяржаўных СМІ дастаткова аб’ектыўныя матэрыялы. Сярод іх вылучаюцца артыкулы пра ролю музейных устаноў у жыцці сучаснага грамадства, складанасці дзейнасці рэгіянальных музеяў (праблемы камплектавання і зацікаўлення наведвальнікаў, складанасці функцыянавання створаных з савецкім размахам комплексаў), перанос новых мемарыяльных музеяў, праблемы музеефікацыі аб’ектаў архітэктурнай спадчыны.

Музей – гэта экспанаты, экскурсаводы, турысты, для якіх рэстаўруюцца нашы сядзібы і палацы. Але часам госцю, які наведаў экспазіцыі музеефікаваных архітэктурных помнікаў, наўрад ці захочацца вярнуцца яшчэ. Наш край называюць краінай палацаў і замкаў. Паўнавартаснымі турыстычнымі аб'ектамі з'яўляюцца толькі Нясвіжскі і Мірскі замкі. Музеефікацыя падобных аб'ектаў выклікае мноства пытанняў. Яскрава сведчыць пра гэта матэрыял пра Ружанскі палац Сапегаў. Сапраўдных рэчаў, якія яшчэ памятаюць Сапегаў, сярод экспанатаў музея «Палацавы комплекс Сапегаў» вы тут не ўбачыце. Патомкі Сапегаў, у адрозненне ад Радзівілаў, да сваёй спадчыны на беларускіх землях адмысловай цікавасці не праяўляюць [7].

Падчас гаворкі з журналістамі кіраўнікі музеяў адзначаюць, што установам культуры не хапае плошчаў для захавання і прэзентацыі сваіх збораў. Музей Беларускага Палесся быў адкрыты ў 1926 г. у Пінску і размешчаны ў калегіуме іезуітаў. Аснову збору складаюць аўтэнтычныя прадметы, супрацоўнікі падчас экскурсій выкладваюцца на сто працэнтаў, але адчуваецца адсутнасць адзінай канцэпцыі і мастацкага рашэння пры стварэнні экспазіцыі. Не будзе лішнім пры праектаванні новай экспазіцыі ўлічыць той факт, што буды-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нак музея з’яўляецца гістарычным помнікам. Адной з прычын «буксавання» рэканструкцыі экспазіцыі, на думку работнікаў музея, з’яўляецца пытанне пошуку фінансавых рэсурсаў [17]. У той жа час вывучэнне матэрыялаў айчынных СМІ прадэманстравала, што пры жаданні і адпаведнай працы супрацоўцы пытання рэгіянальныя музеі паспяхова вырашаюць праблемы фінансавання, з якімі сення сутыкаюцца амаль усе музейныя ўстановы краіны [11; 12]. Публікацыі сведчаць, што на працягу апошніх гадоў сітуацыя змяняецца да лепшага: дзяржавай робяцца значныя крокі па паляпшэнню сітуацыі з будынкамі музейных устаноў [9; 10].

Асобую праблему ўяўляе кадравы састаў. Супрацоўнікі ў сталым ўзросце не ў стане далучыцца да сучасных інфармацыйных і інтэрактыўных тэхналогій, а маладым спецыялістам не хапае вопыту ў ажыццяўленні традыцыйных накірункаў музейнай дзейнасці. Кіраўнік Баранавіцкага краязнаўчага музея А. Самушчава адзначае ў інтэрв’ю, што музею неабходна пашырэнне штату: тры навуковых супрацоўніка, спецыялісты для вядзення сайта і аўдыягіда, прафесійны экскурсавод для арганізацыі выездаў да раённых помнікаў культуры. Баранавіцкія работнікі музея рэгулярна наведваюць калег у іншых кутках Беларусі, але адзначаюць, што для паспяховай работы ў рэгіёнах быў бы карысны выезд спецыялістаў у краіны-суседкі для абмену вопытам і высвятлення магчымасцяў стварэння сумесных праектаў [23]. З другога боку, часта кіраўнікамі музеефікаваных аб’ектаў гісторыка-культурнай спадчыны становяцца маладыя выпускнікі гістарычных факультэтаў. Напоўніць экспазіцыю, выканаць план па аказанню платных паслуг і зрабіць палацы і замкі культурнымі цэнтрамі адначасова ім проста не пад сілу з прычыны аб’ектыўных абставін. Пра гэта сведчыць матэрыял пра Ружанскі палац Сапегаў [7].

Шмат увагі айчынныя СМІ надаюць пытанням музеефікацыі літаратурнай спадчыны. Найбольш актыўна праблема



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

падымаецца ў матэрыялах газеты «Звязда». Можна адзначыць два аспекты матэрыялаў: праблемы самой музеефікацыі і актывізацыя дзейнасці па павелічэнню колькасці наведвальнікаў. Як паўстае з артыкулаў, часткова праблемай з'яўляецца месцазнаходжанне мемарыяльных музеяў-сядзіб. Так, у матэрыяле, прысвечаным пераносу музея М. Гарэцкага з малой радзімы літаратара, вёскі Багацькаўка, у Мсціслаў, адзначаецца, што для захавання мемарыяльнага музея у роднай вёсцы неабходна стварэнне спецыяльных экскурсійных маршрутаў, наяўнасць адпаведнай турыстычнай інфраструктуры (інфармацыйных цэнтраў, дастойных аб'ектаў харчавання і размяшчэння), актыўная рэклама [4; 5; 16].

У прыгаданых публікацыях прагучала вельмі актуальная для Года малой радзімы думка старшыні БФК У. Гілепа аб неабходнасці ствараць у межах кожнага раена музей выбітнага роду, пэўнага ўшанавання. Старшыню БФК падтрымліваюць і кіраўнікі мясцовых музеяў. У публікацыі з нагоды адкрыцця Буда-Кашалёўскага раённага краязнаўчага музея яго дырэктар Н. Лагунова падзялілася сваім меркаваннем з карэспандэнтам газеты «СБ»: «Музей павінен не толькі адукоўваць, але і змяняць сумленне наведвальнікаў, каб яны пачалі думаць пра тое месца, дзе жывуць. У той жа час краязнаўчы музей павінен быць крыніцай ведаў, адукацыі і развіцця культуры насельніцтва. А ўжо задача горада – зрабіць так, каб госці знаходзіліся тут даўжэй, каб яны палюбілі музей ўсёй душой» [10; 16].

Публікацыі газеты «Звязда» і праекта TUT.BY не абмінаюць і тэму школьных музеяў, якія ў нашай краіне маюць багатыя традыцыі. Многія школьныя музеі маюць настолькі багатыя зборы, што на аснове некаторых з іх меркавалася ствараць раённыя краязнаўчыя музейныя ўстановы. Школьныя музеі – гэта яшчэ і добрыя прафарыентацыйныя цэнтры. Адной з балючых праблем гэтых музеяў з'яўляецца фінансавае пытанне. Асноўная частка школьных музейных



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

экспазіцый была створана ў 1980–1990-я гады, і сёння яны ўжо нават маральна састарэлі, іх трэба абнаўляць. Школьныя музеі, на жаль, не фінансуюцца, і асноўная надзея тут на спонсараў [2].

Рухаючыся ў тэндэнцыях часу, вядучыя СМІ актыўна рэкламуюць у сваіх публікацыях дзейнасць вясковых музеяў. У мінулым годзе Гудзевіцкі музей літаратуры і краязнаўства адзначыў 50-годдзе. У. Караткевіч, В. Быкаў, І. Мележ, П. Панчанка ў свой час атрымалі гудзевіцкія паясы і закладкі ў падарунак. З Захаду прыйшоў новы трэнд – цікавасць да этнічнага. І музеі беларускага памежжа атрымалі шанс «з разбегу ўскочыць» у бурную турыстычную дзейнасць, павысіць прывабнасць трансгранічнага рэгіёну. Многія ладзяць паломніцтва ў Гудзевічы дзеля этнаграфічнага аддзела – хаткі і рэчаў, што ў ёй знаходзяцца: качарга, рагачы, абіякі, спарыш, кацуба [18]. Аматарам літаратуры і тэатральнай творчасці можна параіць наведаць літаратурны музей К. Чорнага, створаны каля 50 гадоў таму ў Цімкавіцкай сярэдняй школе на Капыльшчыне. Дзейнасць па мемарыялізацыі творчасці пісьменніка і пераносу літаратурнай спадчыны на тэатральную пляцоўку за гэты перыяд аб'яднала вакол музея не толькі вучняў, але і некалькі пакаленняў жыхароў Цімкавічаў [13].

Праведзены аналіз зместу публікацый СМІ дазваляе зрабіць выснову аб цікавасці да музейнай тэмы. Разглядаючы ў якасці крыніцазнаўчай адзінкі кожную асобную публікацыю, можна канстатаваць, што пры асвятленні дзейнасці музейных устаноў краіны знайшлі адлюстраванне ўсе аспекты жыцця музеяў краіны. Публікацыі СМІ незаменны пры вывучэнні штодзённасці, адлюстроўваюць рэаліі часу, у якім функцыянуюць музейныя ўстановы краіны. Яны судзейнічаюць актуалізацыі гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. *Бойцов, Е.* Примерка кольца // Е. Бойцов // СБ. Беларусь сегодня. – 2015. – № 65. – 7 апр.

2. *Зигуля, Н.* Школьные музеи на любой вкус можно найти в Могилевской области [Электронный ресурс] / Н. Зигуля // Звязда. – 2017. – 12 дек. – Режим доступа: http://zviazda.by/ru/news/20171212/1513065533-shkolnye-muzei-na-lyuboy-vkus-mozhno-nayti-v-mogilevskoy-oblasti.

3. *Зігуля, Н.* Адсюль пагражаць мы будзем шведу [Электронны рэсурс] / Н. Зігуля // Звязда. – 2017. – 1 ліст. – Рэжым доступу: http://zviazda.by/ru/node/118954.

4. *Зігуля, Н.* Літаратурны музей Максіма Гарэцкага можа пераехаць у Мсціслаў [Электронны рэсурс] / Н. Зігуля // Звязда. – 2016. – 2 снеж. – Рэжым доступу: http://zviazda.by/be/news/20161219/1482168726-litaraturny-muzey-maksima-gareckaga-mozha-peraehac-u-mscislau.

5. *Зігуля, Н.* Як прывабіць наведвальніка ў літаратурныя музеі? [Электронны рэсурс] / Н. Зігуля // Созвучие: па матэрыялах выд-ва «Звязда». – 2017. – 6 ліп. – Рэжым доступу: http://www.sozvuchie.by/proekty/mikail-mushvig/item/876-yak-pryvabits-navednika-u-litaraturnyya-muzei.html.

6. *Козлович, В.* Анна и Мельпомена [Электронный ресурс] / В. Козлович // СБ. Беларусь сегодня. – 2007. – Режим доступа: https://www.sb.by/articles/anna-i-melpomena.html.

7. *Козлович, В.* Ноктюрн у дворцовых ворот [Электронный ресурс] / В. Козлович // СБ. Беларусь сегодня. – 2017. – 7 апр. – Режим доступа: https://www.sb.by/articles/noktyurn-u-dvortsovykh-vorot.html.

8. *Коско, С.* Урок любви к родной земле / С. Коско // СБ. Беларусь сегодня. – 2015. – № 213. – 2014. – 6 нояб.

9. *Лайкова, В.* На Гомельщине после реставрации открылась усадьба Козел-Поклевских / В. Лайкова // СБ. Беларусь сегодня. – 2015. – 15 март. – Режим доступа: https://www.sb.by/articles/na-gomelshchine-posle-restavratsii-otkryta-usadba-kozel-poklevskikh.html.

10. *Леонович, Ю.* Ежедневный урок истории [Электронный ресурс] / Ю. Леонович // Созвучие: по материалам изд-ва «СБ. Беларусь сегодня». – 2018. – 20 март. – Режим доступа: http://belsmi.by/news/culture/24959/.

11. *Леонович, Ю.* Нота непонимания / Ю. Леонович. – СБ. Беларусь сегодня. – 2016. – № 201. – 19 окт.

12. *Макеева, А.* Житель «Дома на набережной» и соперник Ленина [Электронный ресурс] / А. Макеева // TUT BY MEDIA. – Режим доступа: https://news.tut.by/culture/606481.html.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

13. *Макеева, А.* «Наш Достоевский». Что посмотреть в музее Кузьмы Чорного [Электронный ресурс] / А. Макеева // TUT BY MEDIA. – Режим доступа: https://news.tut.by/culture/605691.html.

14. *Макеева, А.* Пока тушил огонь, одежда и сапоги дымились. Что посмотреть в Наровле? [Электронный ресурс] / А. Макеева // TUT BY MEDIA. – Режим доступа: https://news.tut.by/culture/598081.html.

15. *Наумова, А.* Житель Новополоцка передал в музей 4000-летний топор [Электронный ресурс] / А. Наумова // СБ. Беларусь сегодня. – 2017. – Режим доступа: https://www.sb.by/articles/zhitel-novopolotska-peredal-v-muzey-4000-letniy-topor.html.

16. *Овсепьян, И.* Как пройти к Горецкому? / И. Овсепьян // СБ. Беларусь сегодня. – 2017. – № 6. – 11 янв.

17. *Кирьянов, А.* Передержанная экспозиция [Электронный ресурс] / А. Кирьянов // СБ. Беларусь сегодня. – 2015. – 14 мая. – Режим доступа: https://www.sb.by/articles/perederzhannaya-ekspozitsiya.html.

18. *Садоўская, М.* Падарожжа ў Гудзевіцкі музей [Электронны рэсурс] / М. Садоўская // Звязда. – 2018. – 29 мая. – Рэжым доступу: http://zviazda.by/be/news/20180528/1527516507-padarozhzha-u-gudzevicki-muzey.

19. *Свірко, І.* Гісторыя да запатрабавання [Электронны рэсурс] / І. Свірко // СБ. Беларусь сегодня. – 2016. – 10 ліст. – Рэжым доступу: https://www.sb.by/articles/gistoryya-da-zapatrabavannya.html.

20. *Свірко, І.* Папаўненне ў доме Мяшчэрскіх / І. Свірко // СБ. Беларусь сегодня. – 2017. – № 237. – 15 дек.

21. *Северин, И.* В Большой Берестовице открылся музей, где живет настоящая белка [Электронный ресурс] / И. Северин // TUT BY MEDIA. – Режим доступа: https://news.tut.by/kaleidoscope/418740.html.

22. *Тарасевич, К.* «Уголочек бюрократа» и инсталляция с Мэрилин Монро. Что посмотреть в «Цікавым музеі» [Электронный ресурс] / К. Тарасевич // TUT BY MEDIA. – Режим доступа: https://news.tut.by/culture/583608.html.

23. *Юргель, Р.* Чым раенны краязнаўчы музей можа прывабіць турыста [Электронный ресурс] / Р. Юргель // Звязда. – 2017. – 28 дек. – Рэжым доступа: http://zviazda.by/be/news/20171227/1514393244-chym-rayonny-krayaznauchy-muzey-mozha-pryvabic-turysta.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ